Кушнір М.А., студ. гр. 420 н ФТБКіСМ
БДУ культуры і мастацтваў
Навуковы кіраўнік – Шамрова В.А.,
выкладчык

## ПРАБЛЕМА КЛАСІФІКАЦЫІ БЕЛАРУСКАГА ХАРЭАГРАФІЧНАГА ФАЛЬКЛОРУ

Фальклор у цэлым і харэаграфічны фальклор у прыватнасці ўяўляе сабой мастацкую калектыўную творчасць народа, у якой адлюстроўваецца яго жыццё, погляды, ідэалы, выяўляюцца адметныя рысы гісторыі, псіхалогіі, ментальнасці, побыту. Беларускі харэаграфічны фальклор у навуковай літаратуры прадстаўлены мінімальнай колькасцю выданняў, найбуйнейшымі з якіх з'яўляюцца “Беларускі харэаграфічны фальклор”, “Беларускі народны танец” Ю.М. Чурко, электронная версія фальклорна-этнаграфічных экспедыцый – складальнік С.В. Гуткоўская, “Беларускія народныя танцы, карагоды, гульні” Л.К. Алексютовіч.

Пытанне класіфікацыі беларускай танцавальнай творчасці да гэтага часу застаецца без адпаведнай увагі навукоўцаў, можна прыгадаць толькі некалькі прозвішчаў аўтараў, якія звярталіся да гэтай тэмы (Л.К. Алексютовіч, Ю.М Чурко, М.А Козенка). Пад класіфікацыяй разумеецца упарадкаванне паняццяў і прадметаў паводле пэўных прынцыпаў, законаў, прыкметаў як яе асновы [4, с.311-312]. Сутнасць праблемы існуючых класіфікацый беларускага харэаграфічнага фальклору заключецца ў недапрацаванасці сістэмы, у адсутнасці лагічна абгрунтаваных адзіных крытэрыяў дыферэнцыяцыі харэаграфічных узораў. Узгаданыя намі сістэмы аўтараў дастаткова адрозныя, маюць розныя падставы класіфікацыі.

На наш погляд, найбольш слушнай з'яўляецца класіфікацыя беларускага харэаграфічнага фальклору на групы карагодаў, танцаў і скокаў. Дыферэнцыяцыя ў гэтым выпадку адбываецца паводле крытэрыя жанру,

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

групы вылучаюцца на падставе выяўлення марфалагічнай структуры танца. Такі прынцып класіфікацыі быў прапанаваны прафесарам Ю.М. Чурко, і выкарыстоўваецца таксама ў працах М.А. Козенкі. Класіфікацыя Л.К. Алексютовіч не мае пэўных крытэрыяў, бо аўтар акрамя вышэй азначаных груп карагодаў, танцаў і скокаў вылучае асобна гульні, полькі і кадрылі.

Паводле класіфікацыі Ю.М. Чурко група танцаў складаецца з беларускіх традыцыйных танцаў, кадрыляў, полек, гарадскіх бытавых танцаў, вылучаюцца падгрупы паводле марфалагічнай структуры харэаграфічнага ўзору, што мае пад сабой лагічна абумоўленыя падставы [6, с.16-19]. Падобную дыферэнцыяцыю танцавальнага фальклору ўжывае М.А. Козенка, але нароўні з вылучанымі паводле жанру падгрупамі кадрыляў і полек даследчык вылучае падгрупу вальсаў. У групе танцаў класіфікацыі Ю.М. Чурко апошнюю падгрупу складаюць гарадскія бытавыя танцы, якіх няма ў сістэмах іншых аўтараў. Пытанне аб вылучэнні самых позніх па часе з'яўлення ў культуры беларусаў танцаў мае, на наш погляд, складаны і спрэчны характар. Падгрупу складаюць спрошчаныя беларускія традыцыйныя танцы, танцы замежныя, якія выконваліся ў вёсках на сваю манеру, "як прывыклі" і "як умелі" (таму часцей за ўсё ад замежнага танцу пакідалі толькі рытм і музычны памер), а таксама гарадскія танцы, якія ў сваёй аснове мелі ўжо перамешаную жанравую, структурную і стылістычную "кашу". Паводле марфалагічнага прынцыпа Ю.М. Чурко вылучае блокавую структуру гарадскога бытавога танцу, што дае падставы, на яе думку, аднесці гэты від харэаграфіі ў асобную падгрупу [6, с.243], але падобную структуру таксама мелі і іншыя ўзоры беларускага народнага танцу. На наш погляд, існуе праблема вызначэння месца падгрупы гарадскіх бытавых танцаў, магчыма, яе трэба пакінуць толькі у гісторыі новай і сучаснай побытавай харэаграфіі.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Падгрупа традыцыйных беларускіх танцаў падзяляецца паводле тыпу і арганізацыі руху на ілюстрацыйна-выяўленчы, арнаментальны і гульнёвы, першы з якіх магчыма падзяліць паводле крытэрыя аб’екта адлюстравання на танцы, якія паказваюць працоўныя працэсы, з’явы прыроды, характар паводзін чалавека, рухі жывёлаў і птушак [2, 6].

Крытэрыем класіфікацыі карагодаў з’яўляецца жанр, які дамініруе ў цесназвязаным трыадзінстве танца, песні і драматычнай дзеі. Такім чынам існуюць песенныя, гульнёвыя і танцавальныя карагоды. Л.К. Алексютовіч вылучае групу карагоднага шэсця, але далей даследчыкі прыходзяць да высновы слушнасці азначэння дадзенага віду песенным карагодам, Ю.М. Чурко карагодную гульню вылучае як падгрупу гульнёвага карагоду [6, с.96].

Беларускі харэаграфічны фальклор М.А. Козенка класіфіцыруе згодна з гісторыка-стылявымі пластамі. Аўтар вылучае танцы раннетрадыцыйныя, куды ўваходзяць карагоды, беларускія традыцыйныя танцы і скокі, падпарадкаваныя абрадавай функцыі, і познетрадыцыйныя, у межах гэтай групы існуюць асіміляваныя танцы, якія выконваюць пазаабрадавую функцыю. Акрамя таго аўтар робіць шматступеннае раздзяленне беларускага харэаграфічнага фальклора (акрамя групы скокаў) паводле крытэрыяў функцыі, жанру, стылю, складу выканаўцаў. Такім чынам, у дачыненні да функцыі, якую выконвае той ці іншы харэаграфічны ўзор, карагоды і танцы могуць быць абрадавымі, прымеркаванымі да абрада і пазаабрадавымі. Неабходна дадаць, што абрадавы танец з’яўляецца раннетрадыцыйным, уключае ў сваю групу белаларускія традыцыйныя танцы, а пазаабрадавы – суадносна познетрадыцыйны, з падгрупамі полек, кадрыляў і вальсаў у сваім складзе. Функцыю прымеркаванасці да абраду могуць выконваць танцы абодвух гісторыка-стылявых пластоў.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Дыферэнцыяцыя паводле жанру намі была акрэслена вышэй, гэты аспект класіфікацыі мы прынялі за асноўны. М.А. Козенка ў сваіх даследваннях вылучае сістэму падкрытэрыяў унутры крытэрыя стылю: паводле лексікі, кампазіцыі, малюнку і формы для карагодаў і паводле лексікі, кампазіцыі і структуры для танцаў. Калі мы разгледзім наступныя ступені класіфікацыі, мы заўважым, што яны маюць розныя падставы: лексіка ў групе карагодаў падзяляецца на рэгламентаваную і нерэгламентаваную, а танцавальная лексіка класіфіцыруецца паводле тыпу, формы і суб’екту, крытэрыем кампазіцыі для карагодаў з’яўляецца колькасць фігур, а для танцаў – характарыстыка кампазіцыі як устойлівай, свабоднай і мяшанай і г.д. Класіфікацыя складу танцораў адбываецца паводле ўзроставых, гендэрных асноў, формы выканання (сольныя, гуртавыя і масавыя танцы) а таксама сюды ўключаецца народная тэрміналогія, што выклікае пэўныя пытанні.

Трэцяя жанравая група – скокі, выклікае найменш пытанняў: Ю.М. Чурко вылучае формы пераплясаў, сольных, гуртавых і масавых танцаў паводле колькасці ўдзельнікаў, М.А. Козенка класіфіцыруе скокі паводле гендэрнага складу і колькасці выканаўцаў, што нельга прыняць адназначна.

Такім чынам, у сферы беларускай харэаграфіі існуе шэраг актуальных праблем, патрабуючых якаснага вырашэння, у прыватнасці тэарэтычных асноў класіфікацыі танца, без якіх немагчымае далейшае вывучынне харэаграфічнай традыцыі беларусаў як з тэарэтычнага, так і з практычнага боку. Грамадская патрэба ў вывучэнні і выкананні беларускага харэаграфічнага фальклору відавочная: на хвалі росту папулярнасці этнічнай культуры беларускі танец мае ўсе магчымасці да адраджэння і аднаўлення. Ужо сёння праводзіцца шэраг фальклорных мерапрыемстваў з абавязковай прысутнасцю ў праграме беларускіх танцаў, якія карыстаюцца вялікім поспехам.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Список литературы:

1. Алексютович, Л.К. Беларуские народные танцы, хороводы, игры. Под редакцией М.Я. Гринблата/ Л.К. Алексютович – Мн.: Вышэйшая школа, 1978. —528 с.

2. Даследаванні лакальнай культуры Беларусі: Праграмы па зборы фальклорна-этнаграфічных матэр'ялаў/ Навуковы кіраўнік праэкта, агульнае рэдагаванне: Т.Б. Варфаламеева – Мн.: Беларускі дзяржаўны універсітэт культуры і мастацтваў, 2008. — 406с.

3. Дубянецкі, Э.С. Культуралогія: Энцыкл.даведнік/ Э.С. Дубянецкі. – Мн.: БелЭн, 2003. — 384 с.

4. Краткий словарь по философии. Более 1000 статей. / Авт.-сост. Н.Н. Рогалевич. – Минск.: Харвест, 2007. — 832 с.

5. Традыцыйная культура і дзеці: праблемы этнавыхавання. В.З. Мін. К-ры РБ. УА "Беларускі Дзяржаўны Інстытут Праблем Культуры"- Мн., 08.

Чурко, Ю.М. Белорусский хореографический фольклор/ Ю.М.Чурко – Мн.: Вышэйшая школа, 1990. — 415 с.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ